ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.25 (3051) ● ПЯТНІЦА, 6 ліпеня, 2007

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Фестываль як сапраўднае свята
Стар. 2

У назвах сталічных вуліц — знакамітыя імёны
На пасяджэнні Тапанімічнай камісіі пры Мінскім гарадскім выканаўчым камітэце новым вуліцам вырашана прысвоіць імёны Стар. 3

Мастак, які праславіў Віцебск на ўвесь свет
У пачатку ліпеня спаўняецца 120 гадоў з дня нараджэння Марка Шагала Стар. 4

Жанчыны разумеюць адна адну без перакладу

У Мінску адбылася сустрэча з членамі парламенцкай дэлегацыі Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі

Ірына Цімохіна

Тэмай размовы стала гендэрная роўнасць. У сваім вітальным слове старшыня Беларускага саюза жанчын Надзея Ермакова заўважыла, што адной з буйных грамадскіх арганізацый рэспублікі з’яўляецца менавіта Беларускі саюз жанчын, які налічвае ў сваіх шэрагах звыш 170 тысяч жанчын. Надзея Ермакова, у прыватнасці, адзначыла, што ў краіне па ініцыятыве Беларускага саюза жанчын мінулы год стаў Годам маці, сёлетні — Годам дзіцяці, а наступны плануецца абвясціць Годам сям’і. Цяпер Беларускі саюз жанчын асабліва цесныя ўзаемасувязі падтрымлівае з жанчынамі В’етнама, Сірыі, Кітая і з задавальненнем будзе супрацоўнічаць з жанчынамі Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі.

Намеснік дырэктара Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар эканамічных навук, сустаршыня Беларускага саюза жанчын Антаніна Морава падрабязна растлумачыла замежным гасцям, чаму Беларусь у галіне гендэрнага раўнапраўя займае першае месца сярод краін былога Саюза і 52-е — у свеце.

Цяпер 30 працэнтаў Нацыянальнага сходу —жанчыны, што больш, чым у Вялікабрытаніі, ЗША, Італіі. Што датычыцца выканаўчай улады, то яе пакуль прадстаўляе ўсяго адна жанчына-міністр. Істотна за апошнія выбары вырасла колькасць жанчын у мясцовых Саветах дэпутатаў — амаль 50 працэнтаў.

Намеснік старшыні Сумеснага назіральнага камітэта па паляпшэнню ўзроўню жыцця і статуса жанчын Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Мэйб Эліза Сісі паведаміла, што ў яе краіне жанчыны складаюць 54 працэнты. Пры гэтым колькасць жанчын у парламенце складае 13 працэнтаў і трэцюю частку — сярод міністраў. Наогул, што датычыцца працоўнай занятасці афрыканскіх жанчын, то праблемай апошняга часу для краіны стала павелічэнне выпадкаў скасавання шлюбу па прычыне высокага ўзроўню заработнай платы жанчын.

«Нам вельмі многае трэба яшчэ зрабіць у галіне падрыхтоўкі навуковых кадраў», — заўважыла спадарыня Мэйб. Нагадаем, што ў беларускай навуцы на сёння працуе 61 працэнт жанчын, 58 працэнтаў кандыдатаў і 45 працэнтаў дактароў навук — жанчыны.

БЕЛТА

Члены парламента Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі падчас сустрэчы ў Мінску

Блізкія суседзі ўшаноўваюць памяць песняра

Вольга Карнеева

У польскім Гданьску адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага знака, прысвечанага класіку беларускай літаратуры Янку Купале. На знаку, які ўяўляе сабой камень, замацавана памятная дошка з імем пісьменніка, гадамі жыцця і словамі паэта “Мне сняцца сны аб Беларусі”. На дошцы таксама адліты вядомы верш Купалы “О так! Я — пралетар!..”.

У мерапрыемстве ўдзельнічалі прэзідэнт горада Павел Адамовіч, Генеральны консул Беларусі ў Гданьску Руслан Есін, прадстаўнікі беларускай дыяспары, дзелавых колаў, журналісты, дыпламаты.

Павел Адамовіч падкрэсліў блізкасць беларускай і польскай культур, а таксама адзначыў уклад Янкі Купалы ў агульнаеўрапейскую духоўную спадчыну. Па словах прэзідэнта горада Гданьска, неабходна папулярызаваць сярод моладзі універсальныя каштоўнасці, пра якія некалі пісаў беларускі класік.

Генеральны консул Руслан Есін у сваю чаргу сказаў пра важнасць адкрыцця помніка на тэрыторыі суседняй дзяржавы. Па словах дыпламата, мясцовыя ўлады надаюць вялікую ўвагу дзейнасці беларускай дыяспары ў рэгіёне і ствараюць умовы для падтрымкі нацыянальных традыцый і культуры на Памор’і.

У Генеральным консульстве Беларусі ў Гданьску з нагоды 125-годдзя са дня нараджэння Янкі Купалы адкрыта выстава работ Васіля Шаранговіча. Вядомы беларускі мастак прысвяціў свае палотны жыццю і творчасці Янкі Купалы, ёсць там і карціны, напісаныя па матывах твораў пісьменніка.

Памятны знак Янку Купале знаходзіцца на названай у гонар класіка беларускай літаратуры вуліцы. Напярэдадні адкрыцця помніка Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка правёў у Гданьску сустрэчу з прадстаўнікамі беларускай дыяспары.

ВЕСТКІ

Візы будуць выдаваць хутчэй

Ганна Бондарава

Пасольства Літвы ў Беларусі мае намер пашырыць генеральнае консульства ў Гродне. Робіцца гэта дзеля таго, каб палепшыць умовы выдачы віз для беларускіх грамадзян, паведаміў журналістам Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Эдмінас Багдонас.

Па словах дыпламата, сёння вядзецца рэканструкцыя консульскага аддзела пасольства Літвы ў Мінску, якую плануецца завяршыць да канца жніўня. Пасол перакананы, што гэта дазволіць вырашыць праблему чэргаў.

Эдмінас Багдонас падкрэсліў таксама, што літоўскія дыпламаты сур’ёзна ставяцца да грамадзян, якія прыходзяць за візамі, сумесна шукаюць шляхі паляпшэння ўмоў работы консульскага аддзела пасольства. Дыпламат выказаў пажаданне, каб грамадзяне Беларусі планавалі свае паездкі ў Літву загадзя і своечасова звярталіся ў дыпламатычнае прадстаўніцтва за атрыманнем віз.

Стасункі становяцца прывабнымі

Беларуска-румынскія адносіны ў сферы турызму выходзяць на новы ўзровень.

Саветнік па гандлёва-эканамічных пытаннях пасольства Беларусі ў Румыніі Аляксандр Махнавет паведаміў, што сёння беларускія тураператары ўсё больш актыўна пранікаюць на румынскі рынак. Развіваюцца новыя турыстычныя маршруты як на марскіх курортах, так і на лячэбных азёрах. Пры гэтым ён адзначыў, што цяпер асноўная маса турыстаў на румынскім курорце — гэта грамадзяне Беларусі.

Румынскія турфірмы вельмі зацікаўлены ў абмене турыстамі. “Мы абмяркоўвалі гэтае пытанне з прадстаўнікамі румынскіх турыстычных агенцтваў і распрацавалі план мерапрыемстваў, які ўключае паездкі румынскіх тураператараў у Беларусь, іх азнаямленне з турыстычнымі аб’ектамі нашай краіны”, — паведаміў Аляксандр Махнавет.

Фестываль як сапраўднае свята

Чатыры гадзіны язды ад Мінска — і мы ў невялічкім гарадку у Віцебскай вобласці, які прыгожа завецца Дуброўна. Менавіта тут ужо ў чатырнаццаты раз праходзіў Міжнародны фестываль песні і музыкі “Дняпроўскія галасы ў Дуброўне”, які традыцыйна збірае таленты з Беларусі, Расіі, Украіны — тых краін, якіх звязвае нетаропкая плынь Дняпра.

Кацярына Немагай

КАЦЯРЫНА НЕМАГАЙ

Вось так са святочнага шэсця ўдзельнікаў пачынаўся Міжнародны фестываль “Дняпроўскія галасы ў Дуброўне”

Для маленькага гарадка гэты фестываль — сапраўднае свята. Амаль усе жыхары горада задоўга да пачатку канцэрта збіраюцца каля мясцовага Дома культуры, дзе на адкрытай пляцоўцы павінны выступаць артысты. А тыя, у сваю чаргу, разумеюць жаданні гледачоў пабачыць сапраўднае мастацтва і здзіўляюць іх сваім майстэрствам. Сёлета ў Дуброўна прыехалі калектывы і асобныя выканаўцы з Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай абласцей, Мінска, традыцыйна — з Украіны і Расіі. Больш таго, сярод удзельнікаў былі прадстаўнікі Латвіі і Эстоніі. А з Літвы прыехаў мастацкі калектыў нашых суайчыннікаў “Купалінка”, які вось ужо пяць гадоў працуе пры таварыстве беларускай культуры “Крыніца” ў Клайпедзе.

— Мы вельмі ўдзячны арганізатарам фестывалю за запрашэнне, — усхвалявана гаварыла перад пачаткам канцэрта старшыня суполкі Алена Мірончык. — Для нас, беларусаў, якія жывуць паза межамі радзімы, удзел у святочных мерапрыемствах, фестывалях, што праходзяць у роднай краіне, — творчы стымул, магчымасць часцей бываць на радзіме, адчуваць пульс яе жыцця, радавацца тым зменам, што тут адбываюцца. І, канешне ж, мы прыехалі паказаць сябе. Сваімі песнямі расказаць аб сваім жыцці, пра тугу аб Беларусі.

Дарэчы, гледачы вельмі цёпла прымалі “Купалінку” як на адкрыцці фестывалю, так і на гала-канцэрце ўсіх удзельнікаў. Калі выйшлі на сцэну беларусы Літвы, неяк прыціхла зала, нібы затаіўшы дыханне, чакалі гледачы, на якой мове, якую песню будуць спяваць артысты. Надзеі спраўдзіліся, бо заспявалі яны беларускую народную.

Пакуль гучалі песні, я думала, як беражліва, нібы па драбніцы, збіраюць і захоўваюць беларусы замежжа сваю культуру. Каля васьмідзесяці чалавек уваходзяць у таварыства беларускай культуры “Крыніца”, і збіраюцца яны кожны тыдзень. Дзеляцца навінамі, арганізоўваюць святы, адзначаюць у суполцы дні нараджэння. Ад кіраўніка ансамбля “Купалінка” Валянціны Снігур даведалася, што пры таварыстве дзейнічае нядзельная беларуская школа, штогод вучні яе здаюць экзамен па беларускай мове і часцяком прыязджаюць далей вучыцца ў Беларусь. Працуюць і два дзіцячыя ансамблі, разам з дарослымі іх удзельнікі выступаюць па ўсёй Літве. З пакалення ў пакаленне перадаецца любоў да мовы, роднай культуры.

— Перад фестывалем у Дуброўне мы вельмі хваляваліся, — прызнаецца Валянціна Снігур, — рыхтаваліся з асаблівым натхненнем. Бо гэта ж наша першая творчая паездка, тым больш у Беларусь. У рэпертуары ў нас шмат песень — і беларускія народныя, і літоўскія, і тыя, што пішуць удзельнікі ансамбля. Цікавімся і замежнымі. Але ў Беларусі мы хочам спяваць па-беларуску. Таму наша праграма складаецца ў асноўным з народных песень. Тым больш, што і нацыянальныя касцюмы абавязваюць.

Пасля размовы з Валянцінай падумалася, як было б добра, каб аднойчы з’явілася свята для беларусаў замежжа. Радуе, што такія думкі ўзнікаюць не толькі ў мяне. Галоўны спецыяліст аддзела нацыянальнасцяў апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Міхаіл Рыбакоў запэўніў:

— Ужо ў недалёкім будучым плануецца арганізаваць Фестываль культуры беларускай дыяспары. Акрамя песенных і харэаграфічных калектываў на яго будуць запрашацца майстры народнай творчасці, мастакі. І Фестываль беларусаў замежжа павінен праводзіцца менавіта ў Беларусі: ён будзе злучаць суайчыннікаў з радзімай, а нас знаёміць з культурай беларускага замежжа.

Вельмі б хацелася, каб гэтыя задумы хутчэй ажыццявіліся. Бо дзе б ні гучала беларуская песня, там заўсёды пануе атмасфера свята. Калі не верыце, абавязкова пабывайце ў наступным годзе ў Дуброўне. Туды прыедуць творчыя калектывы беларускай дыяспары, збруцца госці з розных краін. Тады вы пабачыце, як у імгненне вока маленькі гарадок ператвараецца ў сапраўдны цэнтр народнай творчасці, адчуеце гасцінны прыём мясцовых жыхароў, больш даведаецеся аб нацыянальных культурах суседніх краін.

“Гістарычна правільны крок”

Географ і лесавед Аляксандр Дунін-Гаркавіч нарадзіўся, як сведчаць дакументы, што захоўваюцца ў Табольскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі-запаведніку, “в М. Рожане Рожанского прихода...” Гродзенскай губерніі ў 1854 годзе.

Алесь Карлюкевіч

Ён закончыў Гродзенскую класічную гімназію, пасля — Лісічанскае сярэдняе прафесіянальнае вучылішча, што знаходзілася паблізу Санкт-Пецярбурга. Служыў у войску, удзельнічаў у рускатурэцкай вайне, пабываў у Сафіі і Плеўне, атрымаў баявы медаль. Затым былі 13 гадоў службы ў лясніцтвах Разаншчыны.

А следам, пачуўшы водгукі пра Дуніна-Гаркавіча як вопытнага спецыяліста, нашага земляка запрашаюць у Сібір галоўным ляснічым Самараўскага лясніцтва — самага буйнога па тым часе ў Расійскай імперыі. Так Дунін-Гаркавіч парадніўся з Табольскам.

Будучы выключна дасведчаным арганізатарам лесагаспадарчай справы, наш суайчыннік адначасова захапіўся і гісторыка-геаграфічнымі даследаваннямі. Правёў некалькі экспедыцый па Поўначы Заходняй Сібіры. Напісаў у трох тамах грунтоўную гісторыка-краязнаўчую манаграфію “Табольская Поўнач”.

Помнік А. Дуніну-Гаркавічу ў Ханты-Мансійску

І вось сёлетнім чэрвенем у Ханты-Мансійску адкрыты помнік Аляксандру Дуніну-Гаркавічу. Вітанне жыхарам акругі з нагоды ўрачыстасцяў даслаў прэзідэнт Расійскай Акадэміі навук Юрый Осіпаў. Вось што ён, у прыватнасці, напісаў: “Мне вельмі блізкая справа ўшанавання памяці буйнога вучонага і выдатнага чалавека Аляксандра Дуніна-Гаркавіча, якая праводзіцца ў Ханты-Мансійску. На сібірскай поўначы, у месцах, якія ён дэталёва даследаваў, і да якіх быў прывязаны па-чалавечаму, усталяваны яго манумент. Гэта гістарычна правільны крок.”

Дарэчы, Юрый Осіпаў — ганаровы прэзідэнт Грамадскага фонда “Адраджэнне Табольска”, у планах дзейнасці якога значацца многія праекты, звязаныя з памяццю пра Дуніна-Гаркавіча. У Ханты-Мансійскім універсітэце ўсталявана стыпендыя ў гонар нашага земляка. Імем Дуніна-Гаркавіча названа адна з вуліц Табольска.

Два ўзроўні вышэйшай адукацыі

Уладзімір Дорахаў

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі адобрылі праект закона Рэспублікі Беларусь “Аб вышэйшай адукацыі”. Законапраектам замацоўваецца двухступеньчатая сістэма навучання, якая ўключае падрыхтоўку спецыялістаў і магістраў.

Дыпламаваны спецыяліст будзе запатрабаваны для работы на прадпрыемствах, а ступень магістра прызначана для павышэння навыкаў навукова-даследчай работы. Такім чынам, прадугледжана атрыманне студэнтам і двух дакументаў аб вышэйшай адукацыі пасля завяршэння магістратуры. Прызнанне дакументаў аб атрыманні адукацыі будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з дзеючымі міжнароднымі дагаворамі. У законапраекце дадзена азначэнне тыпам вышэйшых навучальных устаноў: класічны універсітэт, профільны універсітэт (акадэмія, кансерваторыя), інстытут, вышэйшы каледж.

У нарматыўным акце таксама прадугледжана новая форма акадэмічнага водпуску — па фінансавых прычынах, калі студэнт платнай формы навучання не ў стане заплаціць за навучанне.

У праекце закона адлюстраваны асаблівасці адукацыйнага працэсу і навуковай дзейнасці ў вышэйшых навучальных установах, акрэслены парадак бягучай і падагульняючай атэстацыі. Заканадаўча замацоўваецца норма аб размеркаванні выпускнікоў, а таксама парадак пакрыцця бюджэтных сродкаў у выпадку адмовы з’явіцца на месца размеркавання.

У назвах сталічных вуліц — знакамітыя імёны

На пасяджэнні Тапанімічнай камісіі новым мінскім вуліцам вырашана прысвоіць імёны дзеячаў культуры

Дзіяна Грышанава

На гэты раз асноўнымі аб'ектамі ўвагі камісіі сталі сталічныя мікрараёны "Брылевічы — 1, 2, 3" (непадалёку ад праспекта Дзяржынскага і вуліцы Сямашкі) і "Дамброўка — 3, 4, 5" (на захадзе сталіцы). Новым вуліцам, якія забудоўваюцца там, вырашана прысвоіць імёны дзеячаў культуры.

Так, у мікрараёне Брылевічы ўвекавечана памяць пра мастака, кампазітара і піяніста Напалеона Орду (2007 год абвешчаны ЮНЕСКА яго годам), польскага грамадска-культурнага дзеяча Ежы Гедройца, чый год адзначаўся ЮНЕСКА летась, беларускага паэта і фальклярыста Яна Чачота.

На захадзе ж Мінска атрымалі сваю "прапіску" пісьменнік, акцёр, рэжысёр, мастак, першы народны артыст БССР Уладзіслаў Галубок, паэт Алесь Гарун, першы прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Усевалад Ігнатоўскі.

Адна з вуліц Дамброўкі названа зборным імем Аладавых. Тут найперш маюцца на ўвазе мастацтвазнавец Алена Аладава і кампазітар Мікалай Аладаў, але таксама і іншыя дзеячы (музыказнавец, архітэктар), якія выйшлі з гэтай таленавітай мінскай сям'і.

А вось прапанова перайменаваць будучую станцыю метро "Пятроўшчына" ў станцыю "Універсітэт" падтрымкі на пасяджэнні камісіі не знайшла. Універсітэтаў у сталіцы ўжо некалькі, і замена канкрэтнай назвы, прывязанай да былой на гэтым месцы вёскі, назвай агульнай толькі дэзарыентавала б пасажыраў метро.


АЛЯКСАНДР РУЖАЧКА

Цэнтр Мінска спалучае гісторыю і сучаснасць

Новы погляд на спадчыну

У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва прайшлі Узвышаўскія чытанні

Адам Мальдзіс

У самым пачатку пленарнага пасяджэння, перад прывітаннямі і дакладамі, слова ўзяў сам… Янка Купала. Удзельнікі чытанняў з хваляваннем (многія — упершыню) слухалі яго голас, які дайшоў да нас у адным з нешматлікіх запісаў. Словы гучалі ўрачыста і надзіва выразна.

VII Узвышаўскія чытанні былі натуральна прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Выступоўцы падкрэслівалі, што гэта, па сутнасці, — пачатак навуковага асэнсавання спадчыны песняра на новым эстэтычным і фактычным узроўні. І гэты ўзровень стаў магчымы дзякуючы выхаду першага Поўнага збору твораў паэта ў дзевяці тамах. Выдаваўся ён супрацоўнікамі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук пад кіраўніцтвам доктара філалагічных навук Міхася Мушынскага. Ён паведаміў прысутным, якія новыя архіўныя матэрыялы выкарыстаны пры падрыхтоўцы выдання, якое стала значнай нацыянальнай падзеяй.

Дырэктар архіва-музея Ганна Запартыка пераказала ўдзельнікам чытанняў кароткі змест успамінаў жыхаркі горада Торунь (Польшча) Беаты Крыстыны Хоміч пад назвай "Сям'я Купалы: Успаміны пляменніцы". Гэтая ўраджэнка беларускага горада Валожын з'яўляецца пляменніцай жонкі паэта, якую ўсе ласкава называлі "Цёцяй Уладзяй, і адначасова сваячкай другога пісьменніка, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, які жыў і памёр на Валожыншчыне (у наступным годзе на ўзроўні ЮНЕСКА будзе адзначацца 200-гадовы юбілей з дня яго нараджэння). Так нечакана выявілася яшчэ адна нітка, якая звязвае годных прадстаўнікоў беларускага пісьменства.

Цяжка і, мусіць, непатрэбна (неўзабаве будзе кніжнае выданне матэрыялаў) пералічваць усіх выступоўцаў на секцыйных пасяджэннях. Выдзелю, бадай, толькі даклады "Славацкія старонкі жыцця Янкі Купалы" Міколы Труса, "З гісторыі першых творчых юбілеяў Янкі Купалы" Ганны Запартыка, "Янка Купала ў італьянскіх выданнях" Аксаны Данільчык, "Купаліяна на англійскай мове" Святланы Скамарохавай, "Згадкі пра Янку Купалу ў дзённіках Якуба Коласа" Валерыя Назарава, бо ў іх разглядаліся новыя для купалазнаўства аспекты. Высокім тэарэтычным узроўнем і навізной фактаў вызначаліся выступленні доктара гістарычных навук Эмануіла Іофе, кандыдатаў філалагічных навук Ірыны Багдановіч, Міхася Кенькі, Жанны Шаладонавай.

Удзельнікі чытанняў пазнаёміліся з цікавай, багатай на невядомыя матэрыялы юбілейнай выставай "У народ і край свой толькі веру…"

У традыцыях глыбокай даўніны

Віктар Раманоўскі

Міжнародны фестываль сярэднявечнай культуры ў Брэсце адкрываўся парадам рыцарскіх клубаў.

Удзел у III міжнародным фестывалі сярэднявечнай культуры "Старажытнае Бярэсце-2007" прынялі каля пятнаццаці рыцарскіх клубаў з гарадоў Беларусі, а таксама з Масквы, Кіева і Варшавы. Фестываль пачаўся парадам рыцарскіх клубаў у гарадскім парку культуры і адпачынку. Тут адбыліся таксама рыцарскія паядынкі і турніры лучнікаў, прайшлі конкурс гістарычных гарнітураў і канцэрт сярэднявечнай музыкі. Брастчане і госці абласнога цэнтра сталі сведкамі займальнай бітвы "Вячэрні бугор", а таксама назіралі феерычнае агнявое шоу Брэсцкага тэатра агню.

Запрашае школьны тэатр

Кастусь Карнялюк

На Беларусі школьны тэатр існаваў з XVI стагоддзя.

У рэчышчы школьнага тэатра разгортвалася і дзейнасць слыннага сына Беларусі Сімяона Полацкага, які лічыцца заснавальнікам школьнага тэатра ў Расіі. З 1765 года дзейнічаў школьны тэатр піяраў у Віцебску. Тыпова асветніцкім тэатрам быў тэатр Забельскай дамініканскай калегіі ў вёсцы Валынцы Верхнядзвінскага раёна, які пачаў дзейнічаць у 1787 годзе. Тэатр тых часоў меў пазнавальна-дыдактычныя і выхаваўчыя мэты, і пераважалі ў ім спектаклі на лацінскай і польскай мовах.

Не забыта тэатральнае мастацтва навучэнцаў і ў нашы дні. Традыцыйны фестываль "Школьны тэатр" прайшоў нядаўна ў Віцебску — ужо ў адзінаццаты раз — на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Адметна, што тут быў прадстаўлены выключна беларускі рэпертуар. А паказвалі шматлікім гледачам сваё самадзейнае мастацтва вучні сярэдніх школ і цэнтраў творчасці дзяцей і моладзі Віцебска.

Вельмі сімвалічна, што вучнёўскія фестывалі адбываюцца на прафесійнай коласаўскай сцэне. Бо, як вядома, вялікі Тэатр многіх прафесійных акцёраў пачынаўся з маленькага — школьнага.

БЕЛТА

Ансамбль “Паазер’е” — адзін з калектываў, што спадабаўся польскім гледачам

Вяселле па-сапраўднаму

Беларускія фальклорныя калектывы сталі лаўрэатамі міжнароднага фестывалю вясельных абрадаў у Польшчы

Ірына Трафілава

Традыцыйны XI Міжнародны фестываль вясельных абрадаў прайшоў у горадзе Вэнгрув, у Мазавецкім ваяводстве Польшчы. У ім прынялі ўдзел фальклорныя калектывы з Беларусі, Польшчы і Украіны.

Цікавы рэгіянальны абрад і багатую канцэртную праграму прадставілі на фестывалі заслужаны аматарскі калектыў Беларусі — фальклорны ансамбль народнай музыкі “Паазер’е”, а таксама клуб народных абрадаў “Традыцыя” з горада Паставы Віцебскай вобласці. Іх выступленні цёпла прыняла публіка. Па выніках конкурсу мастацкія калектывы з Беларусі атрымалі ад арганізатараў культурнага форума дыпломы і прэмію.

На фестывалі прысутнічалі члены ўрада і дэпутаты Сейма Польшчы, кіраўніцтва Мазавецкага ваяводства, прадстаўнікі мясцовых улад, а таксама дыпламаты з пасольстваў Беларусі і Украіны. Арганізатарам форума выступіў Вэнгрувскі цэнтр культуры пры падтрымцы органаў мясцовага самакіравання і Мазавецкага цэнтра культуры ў Варшаве.

Новае жыццё ў прыродзе

Юрый Аксёнаў

У Беларусі па Праграме развіцця Арганізацыі аб’яднаных нацый будзе адноўлена больш за сорак тысяч гектараў тарфяных балотаў.

Па словах начальніка аддзела міжнароднага супрацоўніцтва Мінпрыроды Аляксандра Рачэўскага, па гэтай праграме ўжо праведзены работы на плошчы ў 15 тысяч гектараў.

Аляксандр Рачэўскі адзначыў, што пры аднаўленні балотаў навукоўцы будуць праводзіць дадатковыя даследаванні. Падчас меліярацыі была парушана экасістэма балотаў, нанесена шкода біяразнастайнасці і землям. Па дадзеных навукоўцаў, да 2050 года да сарака працэнтаў усіх відаў жывёл і раслін на зямлі могуць апынуцца на грані знікнення. “Мы павінны аднавіць балотныя ўгоддзі, тым самым Беларусь унясе значны ўклад у змякчэнне ўздзеяння глабальнага пацяплення”, — падкрэсліў Аляксандр Рачэўскі.

Павучкі мудрай Паліны

Кастусь Карнялюк

У Музейным комплексе “Гісторыя і культура Аршаншчыны” сваё адметнае месца займае этнаграфічны музей “Млын”. Больш за усё ў гэтым музеі цікавяць павукі. Дарэчы, усе яны — плеценыя з саломкі — выраблены майстрыхай Палінай Марцінкевіч. Ёй жа гэтую мудрагелістую навуку перадала як спадчыну яе бабуля.

На ўсё жыццё запомніла Паліна, як разам з бабуляй пасля Вялікай Айчыннай вайны выраблялі павучкоў для навагодняй ёлкі. А сёння ўжо Паліна Барысаўна дае майстар-класы ў “Млыне” для аршанскіх вучняў. Цікава, што нашы продкі таксама любілі ўпрыгожваць сваё жыллё саламянымі павукамі.

Саламяны павук звычайна падвешваўся пад столлю і вісеў увесь год да Калядаў. Нашы папярэднікі думалі, што павучок здольны на працягу ўсяго года збіраць усё злое і паганае, прыносіць у хату добрае і шчаслівае. Выраблялі шарападобных, рамбічных і зорчатых павукоў. Згодна з павер’ем, і жывога павука нельга забіваць — у іншым выпадку сям’ю чакае няшчасце.

Студэнцкія захапленні

Вольга Кісялёва

Гродзенскія і маскоўскія студэнты стануць удзельнікамі міжнароднага лагера на Аўгустоўскім канале

Міжнародны студэнцкі лагер, які збярэ актывістаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі трох гродзенскіх вышэйшых навучальных устаноў, аб’яднання “Прагрэсіўная моладзь” з Масквы, а таксама прадстаўнікоў маладзёжнага Савета Паўночна-Заходняй адміністрацыйнай акругі расійскай сталіцы, пройдзе ў ліпені на Аўгустоўскім канале.

Асноўная задача лагера — пазнаёміць маскоўскіх калег з напрацоўкамі па арганізацыі летняга працаўладкавання студэнтаў. Масквічы жадалі б адрадзіць у сябе будатрадаўскі рух, а таму яны вельмі зацікавіліся вопытам Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі ў гэтым пачынанні. У праграме лагера будуць таксама экскурсіі па Аўгустоўскім канале, шмат цікавых конкурсаў і канцэртаў.

Анонс

Нацыянальныя выставы за мяжой у 2007 годзе

У ліпені
Нацыянальная выстава “Беларусь-2007” (г. Цюмень, РФ)

У жніўні
Нацыянальная выстава Рэспублікі Беларусь у Турцыі (г. Стамбул, Турцыя)

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ

Мастак, які праславіў Віцебск на ўвесь свет

У пачатку ліпеня спаўняецца 120 гадоў з дня нараджэння Марка Шагала

Адам Мальдзіс

Як чытачы ўжо, мабыць, заўважылі, у “Нашай галерэі” змяшчаюцца рэпрадукцыі з паштовак, якія прысвечаны адсутным у Беларусі творам нашых суайчыннікаў, у паслядоўным, алфавітным парадку. Але на гэты раз паслядоўнасць парушана. І прычына ёсць важкая: у пачатку ліпеня ў свеце шырока будзе адзначацца гадавіна з часу нараджэння аўтара палотнаў, на якіх лятаюць над Віцебскам не толькі людзі (мастакі), але і анёлы і нават каровы.

Пішу: “з часу нараджэння”, а не з дня, таму што ў даведніках верагодная дата 7 ліпеня стаіць са знакам запытання. Затое цвёрда вядома, што “беларускі і французскі мастак яўрэйскага паходжання” нарадзіўся ў пачатку ліпеня 1887 года ў віцебскай сям’і Захара Шагала і што спасцігаць свет фарбаў і ліній пачаў ён у Віцебскай школе-майстэрні Ю. Пэна. Потым працягваў вучобу ў Пецярбургу ў Л. Бакста (гродзенца родам) і М. Дабужынскага. Некалькі гадоў жыў у Парыжы, дзе аказаўся ў сферы ўплываў еўрапейскага авангардызму. Адсюль у яго творах эмацыянальнасць колераў, нязвыкласць, часам парадаксальнасць сюжэтаў, найчасцей узятых з Бібліі або фальклорных крыніц.

Колеры вітража

З 1914 года М. Шагал зноў у Віцебску. Пасля рэвалюцыі стаў паўнамоцным прадстаўніком па справах мастацтваў у Віцебскай губерні, заснаваў вядомае Віцебскае народнае мастацкае вучылішча. Гораду над Дзвіной прысвечаны яго тагачасныя творы “Стары Віцебск” (1914), “Сіні дом у Віцебску” (1917), “Над горадам” (1918) і іншыя.

Аднак па розных прычынах неўзабаве мастак пакінуў любімы горад. Спярша жыў у Маскве, потым выехаў у Парыж. Ілюстраваў кнігі класікаў, афармляў тэатральныя пастаноўкі, аздабляў вітражамі саборы, пісаў вершы (у 1989 годзе яны выйшлі ў беларускім перакладзе). Віцебск і Парыж дзівосна спалучаліся ў яго творах. Францыю ён пакідаў толькі ў гады Другой сусветнай вайны, калі шукаў паратунку ад фашызму ў ЗША.

“Закаханыя ў зелені”

Памёр Марк Шагал 28 сакавіка 1985 года. Пасля яго засталася добрая памяць — найперш у Францыі і Беларусі. Спадчыне мастака прысвечаны два музеі – адзін у Ніцы, на ўзбярэжжы Міжземнага мора, другі — у Віцебску. У родным горадзе Шагала дзейнічае таксама Артцэнтр яго імя, узвышаецца помнік (скульптар А. Гвоздзікаў), праводзяцца Міжнародныя Шагалаўскія пленэры, навуковыя канферэнцыі. Нядаўна даслалі нам з Віцебска другі выпуск “Шагалаўскага зборніка”. Ва ўсім гэтым бачацца праявы карпатлівай працы дома-музея, які ўзначальвае нястомная шукальніца і даследчыца Людміла Хмяльніцкая.

А на паштоўках, прысланых з Англіі і Швейцарыі, — вітраж М. Шагала, выкананы для універсітэцкага Медычнага цэнтра ў Іерусаліме, і яго карціна “Закаханыя ў зелені”, якая захоўваецца ў Цюрыхскім доме мастацтваў.

Заснавальнік: Рэдакцыя газеты «СБ»
Рэдактар Віктар Харкоў
Адрас: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288—12—80; факс: +375 17 288—12—80
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290—60—11
E—mail: golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
Аб’ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 2000
Заказ: 729
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
© “Голас Радзімы”, 2007